Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С. Пушкіна”
Кафедра беларускай філалогіі

**МЕЛЬНІАВА З.П.**
(2019/2020 н.г.)
Зацверджаны на пасяджэнні
кафедры 21.04.2020, пр. № 10

Пытанні да экзамену па дысцыпліне
**“Гісторыя беларускай літаратуры XX – пач. XXI ст.”**
для студэнтаў 2 к. спец. “Беларуская філалогія”

1. Літаратуры працэс на Беларусі ў пач. XX ст. Роля “Нашай нівы” ў развіцці нацыянальнай культуры і літаратуры.
2. Паэзія “нашаніўскай” пары (Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, А. Гарун, Цётка, К. Буйло, інш.).
3. Проза “нашаніўскай” пары (Я. Колас, Ядвігін Ш., З. Бядуля, М. Гарэцкі, Цётка, інш.).
4. Жыццёвы і творчы шлях М. Багдановіча. Месца і роля М. Багдановіча ў развіцці нацыянальнай паэзіі.
5. Асноўныя тэмы і вобразы паэзіі М. Багдановіча. Зборнік “Вянок”. Шматграннасць дзейнасці М. Багдановіча (пераклады, публіцыстыка, літаратурная крытыка). Проза пісьменніка (“Музыка”, “Апокрыф”, “Апавяданне аб іконніку і залатару”, “Гарадок”, інш.).
6. Месца і роля А. Гаруна ў развіцці нацыянальнай літаратуры. Паэтычны зборнік “Матчын дар”. Проза і драматургія А. Гаруна (“Пан Шабуневіч”, “У Панасавым сяле”, “Свята”, “П’ер і Каламбіна”, “Хлопчык у лесе”, інш.).
7. Ядвігін Ш. як адзін з пачынальнікаў беларускай прозы. Аналіз твораў пісьменніка.
8. Звесткі з біяграфіі Цёткі. Месца і роля пісьменніцы ў развіцці нацыянальнай літаратуры. Кнігі паэзіі “Хрэст на свабоду”, “Скрыпка беларуская”. Аналіз вершаў.
9. Проза Цёткі (“Прысяга над крывавымі разорамі”, “Міхаська”, “Зялёнка”, інш.).
10. Жыццёвы і творчы шлях Змітрака Бядулі. Уклад пісьменніка ў станаўленне беларускай літаратуры.
11. Праблематыка і героі прозы Змітрака Бядулі. Аналіз апавяданняў “Бондар”. “Велікодныя яйкі”, “Малыя дрывасекі”, “На каляды к сыну”, “Пяць лыжак зацтркі”, інш.
12. Грамадска-культурнае і палітычнае жыццё на Беларусі ў 20-30-я гады, яго ўплыў на літаратурны працэс. Літаб’яднанні “Маладняк”, “Узвышша”, “Полымя”, іх роля ў развіцці літаратуры.
13. Жыццёвы і творчы шлях Я. Купалы. Шматграннасць творчасці пісьменніка.
14. Лірыка Я. Купалы дарэвалюцыйнай пары (зб. “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”). Асноўныя матывы паэзіі. Вобраз лірычнага героя. Эвалюцыя паэта.
15. Драматычныя паэмы Я. Купалы (“Адвечная песня”, “Сон на кургане”, інш.). Гістарызм мыслення паэта ў паэме “На Куццю”.
16. Фальклорна-рамантычныя паэмы Я. Купалы (“Курган”, “Бандароўна”, “Магіла льва”, інш.). Паэма-ідылія “Яна і я”. Купалаўскі рамантызм.
17. Праблематыка і жанравыя асаблівасці драматургіі Я. Купалы. П’есы “Раскіданае гняздо”, “Паўлінка”, “Прымакі”.
18. Паблематыка і героі п’есы Я. Купалы “Тутэйшыя”. Сцэнічны лёс твора. Асуджэнне тутэйшасці. Вобраз Мікіты Зноска. Сэнс назвы. Жанр твора.
19. Паэзія Я. Купалы 20-х гадоў. Зборнік “Спадчына”. Ідэі Адраджэння, Маладой Беларусі.
20. 30-я гады ў лёсе Я. Купалы. Драма паэта. Вершы “ляўкоўскага цыклу”, іх ацэнка сучасным літаратуразнаўствам.
21. Жыццёвы і творчы шлях Я. Коласа. Шматграннасць творчасці пісьменніка.

22. Станаўленне і развіццё мастацкай індывідуальнасці Я. Коласа-лірыка (зб. “Песні жальбы”, “Водгулле”) і празаіка. “Малая” проза Я. Коласа (“Малады дубок”, “Пісаравы імяніны”, “Крывавы вір”, “Сяргей Карага”, інш.).
23. Алегарычныя навелы Я. Коласа “Казкі жыцця”.
24. Паэма “Новая зямля” Я. Коласа. Праблематыка. Сістэма вобразаў. Мастацкія асаблівасці.
25. Коласаўскае вырашэнне тэмы мастака і мастацтва ў паэме “Сымон-музыка”. Мастацкія асаблівасці твора.
26. Праблематыка, сістэма вобразаў трылогіі Я. Коласа “На ростанях”. Духоўныя пошукі Андрэя Лабановіча.
27. Вырашэнне праблемы прызначэння інтэлігенцыі ў трылогіі “На ростанях” Я. Коласа. Групоўка вобразаў. Кампазіцыя твора. Сэнс назваў аповесцей. Жаночыя вобразы ў творы.
28. Жыццёвы і творчы шлях М. Гарэцкага. Трагізм лёсу пісьменніка-асветніка. Уклад пісьменніка ў станаўленне беларускага літаратурнага працэсу. М. Гарэцкі – даследчык беларускай літаратуры.
29. Антываенныя творы М. Гарэцкага (“Літоўскі хутарок”, “Генерал”, “Рускі”, “На этапе”, інш.). Дакументальна-мастацкія запіскі “На імперыялістычнай вайне”.
30. Асаблівасці ранняй прозы М. Гарэцкага (“Роднае карэнне”, “У лазні”, “У чым яго крыўда”, “Што яно?”, “Красаваў язмін”, інш.).
31. Драматызаваная аповесць “Антон” М. Гарэцкага. Праблематыка і героі твора.
32. Творчасць М. Гарэцкага савецкага перыяду. Чалавек і час ў аповесці “Дзве душы”. Праблематыка. Сістэма вобразаў.
33. Звесткі з біяграфіі і трагізм лёсу М. Зарэцкага. Сацыяльная, маральна-этычная праблематыка, асаблівасці стылю М. Зарэцкага (“Двое Жвіроўскіх”, “Кветка пажоўклая”, “Дзіўная”, “На маладое”, “Голы звер”).
34. Мастацкія асаблівасці рамана М. Зарэцкага “Вязьмо”. Аўтарскае вырашэнне тэмы калектывізацыі. Сістэма вобразаў.
35. Жыццёвы і творчы шлях Кузьмы Чорнага. Месца і роля К. Чорнага ў гісторыі беларускай літаратуры.
36. Апавяданні К. Чорнага “Вялікае сэрца”, “Макаркавых Волька”, “Вераснёвыя ночы”, “Хвоі гавораць”, інш.
37. Эвалюцыя творчасці К. Чорнага 20-х гадоў (раман “Зямля”, аповесць “Лявон Бушмар”).
38. Творчасць К. Чорнага 30-х гадоў: аповесць “Насцечка”, раманы “Бацькаўшчына” або “Трэцяе пакаленне”, аповесць “Люба Лук’янская”). Уплыў часу напісання на мастацкія вартасці твораў.
39. Творчасць К. Чорнага ваеннага часу (апавяданні, раманы “Пошукі будучыні”, “Млечны шлях”, “Вялікі дзень”). Наватарства пісьменніка ў паказе вайны. “Дзённік” К. Чорнага як мастацкі дакумент часу.
40. Звесткі з біяграфіі У. Дубоўкі. Творчае наватарства, уклад у станаўленне абноўленага жанру паэмы. Праблематыка паэм “Кругі”, “І пурпуровых ветразей узвівы”, “Штурмуйце будучыні аванпосты”.